УДК 821.161.3.09(072)

С.В. ДАМБРОЎСКАЯ

# УЗРОВЕНЬ РАЗВІЦЦЯ ЗВЯЗНАГА ВУСНАГА МАЎЛЕННЯ ВУЧНЯЎ V КЛАСА Ў ПРАЦЭСЕ НАВУЧАННЯ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

*Артыкул прысвечаны адной з актуальных праблем методыкі выкладання беларускай літаратуры ў накірунку развіцця звязнага вуснага маўлення вучняў. Прапанаваная аўтарам методыка, заснаваная на асобасна арыентаваным падыходзе, накіравана на актывізацыю маўленчай дзейнасці школьнікаў V–VI класаў і інтэнсіфікацыю працэсу развіцця маўленчых уменняў і навыкаў.*

## Уводзіны

Адна з найважнейшых выхаваўча-гуманістычных задач сучаснай школы – фарміраванне гарманічнай асобы, якая здольна ацэньваць сябе як самадастатковую ў сацыяльнай, духоўнай, інфармацыйнай сферах. Мастацкая літаратура – гэта "па сутнасці сваёй не імітаванне жыцця, а яго адлюстраванне і на гэтай падставе адна з форм яго творчага асваення, пераўтварэння, яго далейшае стварэн-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. Кулешова

не і, такім чынам, адна з форм грамадска-гістарычнага развіцця" [1, с. 10]. У адукацыйным працэсе звязнае маўленне выступае як умова паспяховай вучэбнай дзейнасці, спрыяе сацыяльна-каштоўнаснай арыентацыі, усебаковаму развіццю асобы, яе камунікатыўнай культуры, назапашванню жыццёвага вопыту. "У школьным узросце фарміруецца ўменне прадуманага выкладу сваёй думкі ў вуснай ці пісьмовай форме, г.зн. правільнае, свабоднае ажыццяўленне маўленчай дзейнасці. Ускладненне інфармацыйнага абмену прад'яўляе павышаныя патрабаванні да формаў маўлення, галоўным чынам да звязнага выказвання" [2, с. 25].

**Асноўная частка**

Аб узроўні развіцця ўменняў і навыкаў вуснага маўлення вучняў мы мяркуем па тым, як школьнікі перадаюць засвоеную інфармацыю. З дадзенай мэтай у 2006/2007 навучальным годзе намі была праведзена дыягностыка стану звязнага вуснага маўлення 282 вучняў V класаў. Рэспандэнтам было прапанавана падрыхтаваць вуснае выказванне на тэму "Лес – гэта цэлы свет".

Аналізуючы вусныя выказванні вучняў, мы абапіраліся на вопыт, назапашаны навукай у гэтым пытанні (К. Архангельскі, М.І. Жынкін, Т.А. Ладыжанская, М.С. Кляўчэня, М.М. Кітаеў) [3; 4; 5; 6; 7], улічваючы выпрацаваныя вучэбныя крытэрыі ацэнкі ўменняў і навыкаў звязнага вуснага маўлення. З мэтай атрымаць найбольш поўнае і аб'ектыўнае ўяўленне пра ўзровень развіцця звязнага вуснага маўлення школьнікаў якасныя паказчыкі пераводзіліся ў балы (колькасны крытэрый). Узровень маўленчага развіцця вучняў вызначаўся па агульнай колькасці набраных балаў:

- высокі – 28-34 балаў;
- сярэдні – 21-27 балаў;
- здавальняючы – 11-20 балаў;
- нізкі – 0-10 балаў.

Вынікі дыягностыкі развіцця звязнага вуснага маўлення вучняў V класа наступныя: высокі ўзровень не паказаў ніхто (0%), сярэдні – 36 вучняў (13%), здавальняючы – 167 (59%), нізкі – 79 (28%).

Аналіз маўленчага матэрыялу (дыктафонныя запісы) выявіў высокі працэнт вучняў з нізкім і здавальняючым узроўнямі развіцця звязнага вуснага маўлення, што, безумоўна, перашкаджае найбольш поўнаму засваенню літаратуры як мастацтва слова, а таксама адмоўна ўплывае на якасць засваення ведаў па астатніх прадметах вучэбнага плана.

Вучні ў асноўным маюць абмежаваны, аднастайны лексічны запас, што праяўляецца ў недастатковым для стварэння паўнацэннага мастацкага выказвання ўжыванні мастацкіх сродкаў выразнасці і вялікай колькасці моўных і граматычных памылак: метафары і параўнанні выкарысталі 87 вучняў (31%), словы з памяншальна-ласкальнымі

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

суфіксамі – 66 (23%); не дапусцілі граматычных памылак – 14 вучняў (5%), моўных – 8 (3%).

Аналіз змястоўнасці вусных выказванняў пяцікласнікаў дазволіў аўтару выявіць пэўную тэндэнцыю. Высокую інфармацыйную насычанасць выказванняў (раскрылі тэму поўнасцю) паказалі 70 вучняў (25%). Разам з тым сярод гэтых вучняў 35 (12%) маюць здавальняючы ўзровень развіцця звязнага вуснага маўлення. Атрымліваецца парадаксальная рэч: вучням ёсць што сказаць, яны хочуць гэта данесці да слухачоў, але не могуць, бо не ўмеюць. На жаль, высокі ўзровень сфарміраванасці ўмення фармуляваць галоўную думку ў выказванні паказалі толькі 44 школьнікі (16%). Як нам здаецца, асноўная прычына недастатковай сфарміраванасці дадзенага ўмення – гэта недаацэнка настаўнікам ролі аналітычнай працы з мастацкім тэкстам. Аналітычная дзейнасць на ўроку павінна быць арганізавана такім чынам, каб вучні мелі магчымасць "убачыць" тэкст з розных бакоў.

Дадзеная праблема сведчыць аб неабходнасці развіцця методыкі навучання літаратуры ў накірунку арганізацыі эфектыўнай, заснаванай на асобасна арыентаваным падыходзе працы па актывізацыі маўленчай дзейнасці школьнікаў. Беручы пад увагу "практычнае прызначэнне роднага слова як грамадска-педагагічнага феномена, спосабу матэрыялізацыі і выражэння думкі, сродку, з дапамогай якога наладжваецца суразмоўніцтва, выхаванне, навучанне і развіццё розуму маладых людзей, захоўваецца і перадаецца інфармацыя, культурны вопыт і веды, ствараюцца мастацкія вобразы і каштоўнасці...", В.У. Протчанка лічыць неабходным аддаваць перавагу ў вучэбным працэсе такім метадам і прыёмам працы са словам, "якія найлепш развіваюць самастойнасць школьнікаў, іх мысленне і маўленне і, як вынік, інтэлект" [8, с. 3].

Пры развіцці звязнага маўлення вучняў важная роля належыць выпрацоўцы ўмення лагічна кампанаваць выказванне. На жаль, як паказалі вынікі дыягнастычнага даследавання, толькі ў 129 вучняў (46%) V класа не парушана кампазіцыйная цэласнасць выказвання. Асноўны від працы, які спрые фарміраванню дадзенага ўмення, – складанне цытатнага плана. Значэнне плана ў развіцці маўленчай культуры вучняў адзначае В.В. Галубкоў: "...нігілістычныя адносіны да плана не выпрацоўваюць у школьнікаў навыкаў лагічнага маўлення, і гэта адмоўна адбіваецца на якасці іх сачыненняў і вусных выказванняў" [9, с. 38]. Наступным крокам па развіцці ўменняў і навыкаў звязнага маўлення з'яўляюцца пераказы, якія значна пашыраюць лексічны запас вучняў, спрыяюць актыўнаму папаўненню яго вобразнымі сродкамі, мастацкімі тропамі.

"Культура асобы сучаснага чалавека, – адзначае А.І. Бельскі, – немагчыма без фарміравання камунікатыўнай кампетэнцыі, аснову якой складае ўзровень моўнага, інтэлектуальнага мыслення, вопыт маўленчай дзейнасці, засваенне і актыўнае валоданне лексічнымі багаццямі беларускай мовы" [10, с. 22]. Неабходна вучыць школьні-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

каў не толькі разумець мастацкае слова, але і свабодна валодаць ім. Адным з найбольш эфектыўных спосабаў дыферынцыраванага ўздзеяння на субяседніка з'яўляецца, на нашу думку, аргументаванае, правільнае выкарыстанне ў звязным выказванні сродкаў інтанацыйна-гукавой выразнасці. Акцэнтуючы ўвагу на вялікай ролі інтанацыі ў вусным маўленні, І.Л. Андронікаў адзначаў, што інтанацыя "не толькі ярка выражае адносіны гаворачага да таго, пра што ідзе размова, але адным і тым жа словам можа надаць зусім розныя адценні, бясконца пашырыць іх сэнсавую ёмістасць" [11, с. 231]. Аднак аналіз выказванняў паказаў, што школьнікі не ў дастатковай ступені валодаюць такім прыёмам, як выкарыстанне ў звязным вусным маўленні сродкаў інтанацыйна-гукавой выразнасці.

Як паказалі вынікі эксперыментальнай працы, адным з эфектыўных метадычных прыёмаў, накіраваных на карэкцыю і папярэджанне памылковага ўжывання ў вусным выказванні лексічных канструкцый з парушэннем літаратурных нормаў, а таксама на фарміраванне ўменняў ужываць у вусным маўленні вобразныя і інтанацыйна-гукавыя сродкі, з'яўляецца рэдагаванне тэкстаў вусных выказванняў. Вядома, што "...родная вусная мова засвойваецца ў працэсе актыўнага пошуку дзецьмі моўных заканамернасцей на аснове вопыту і аналізу мовы дарослага і ўласнай творчай дзейнасці" [12, с. 118]. У якасці аўдыяматэрыялу могуць быць выкарыстаны любыя выказванні (вучняў як старэйшых, так і малодшых класаў, настаўніка, мастакоў слова і інш.). Праца па рэдагаванні тэкстаў заснавана на алгарытме абмеркавання вусных выказванняў вучняў.

**Алгарытм абмеркавання вуснага выказвання**

1. Тэма выказвання (адпаведнасць выказвання тэме: поўнасцю, часткова, не раскрыта).
2. Галоўная думка выказвання (раскрыта поўнасцю, часткова, не раскрыта).
3. Выклад матэрыялу (лагічнасць і паслядоўнасць, даступнасць (зразумеласць) і цікавасць выказвання).
4. Мова выказвання (правільная, насычаная мастацкімі сродкамі).
5. Перарывістасць выказвання (доўгія паўзы, сэнсава не абгрунтаваныя паўторы).
6. Выразнасць маўлення:
   - наяўнасць лагічных паўз і націску, іх роля і мэтазгоднасць;
   - тэмп выказвання (хуткі, сярэдні, павольны) і яго адпаведнасць галоўнай думцы;
   - тон выказвання: спакойны, усхваляваны, урачысты, упэўнены, загадны, сумны, жалобны, раздумлівы, саркастычны, радасны, напружаны, ласкавы, мяккі, халодны, іранічны, гумарыстычны;
   - ступень гучнасці.
7. Міміка, жэсты (наяўнасць і адпаведнасць зместу).

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Прапанаваны алгарытм можа быць выкарыстаны на розных этапах працы на ўроку. Гэта залежыць ад той мэты, якую ставіць перад сабою настаўнік: фарміраванне ўменняў вылучаць тэму і асноўную думку, правільна ўжываць сродкі інтанацыйна-гукавой выразнасці, будаваць правільнае з кампазіцыйнага боку выказванне, ужываць лексемы згодна з літаратурнымі нормамі маўлення і інш. Як паказвае практыка, праца з алгарытмам (поўным) патрабуе вялікай колькасці часу, таму такі аналіз вуснага выказвання мэтазгодна праводзіць пасля знаёмства вучняў з асноўнымі паказчыкамі (крытэрыямі) ацэнкі вуснага маўлення.

Згодна з тэорыяй паэтапнага фарміравання ведаў і ўменняў П.Я. Гальперына можна вылучыць наступныя ўмовы, якія неабходны вучню, каб ён мог правільна выканаць новае дзеянне (у нашым выпадку стварыць вуснае выказванне), якое ў будучым ператвараецца ў навык. Да іх, на думку вучонага, можна аднесці "па-першае, апісанне паслядоўных аперацый, з якіх складаецца новае дзеянне; па-другое, поўны набор арыенціраў для кожнай з гэтых аперацый і, па-трэцяе, сістэму ўказанняў, як і ў якім парадку карыстацца гэтымі арыенцірамі і якім спосабам выконваць кожную з аперацый" [13, с. 24-25]. У дачыненні да нашага эксперыментальнага даследавання "апісанне паслядоўных аперацый" – гэта першапачатковыя веды і ўменні паводле асноўных крытэрыяў і патрабаванняў да звязнага маўлення. Алгарытм абмеркавання вуснага выказвання ўяўляе сабой "поўны набор арыенціраў", неабходны для фарміравання асноўных уменняў і навыкаў звязнага вуснага маўлення. Картка ацэньвання вуснага выказвання з распрацаванай бальнай шкалой з'яўляецца "сістэмай указанняў".

М.Г. Яленскі прапануе пры навучанні звязнаму вуснаму маўленню выкарыстоўваць *эгацэнтрычнае маўленне* (разважанне з самім сабой, перш чым выказвацца перад класам) і *метамоўную рэфлексію* (выпраўленне свайго і чужога маўлення, каменціраванае маўленне) [12, с. 192]. Як нам здаецца, такі метад, як эгацэнтрычнае маўленне асабліва актуальны ў V–VI класах, таму што, згодна з тэорыяй П.Я. Гальперына, свядомасць любога дзеяння дасягаецца праз выражэнне думкі метадам прагаворвання ўслых. Свядомасць, як якасць маўленчай дзейнасці, сведчыць аб узроўні сфарміраванасці ўменняў і навыкаў звязнага маўлення. Таксама, як паказалі вынікі эксперыментальнай працы, вучні з вялікай ахвотай прагаворваюць выказванні адзін аднаму. Метамоўная рэфлексія, на нашу думку, пераклікаецца з прапанаваным намі метадам рэдагавання тэкстаў. Пакладзены ў аснову нашага метаду алгарытм абмеркавання вуснага выказвання і распрацаваная шкала ацэньвання дазваляюць ажыццяўляць карэкцыю ўменняў звязнага маўлення, а таксама даюць магчымасць прасачыць дынаміку развіцця камунікатыўных навыкаў у межах канкрэтнай асобы школьніка.

Вяртаючыся да аналізу дыягнастычных дадзеных, хацелася б адзначыць наступны факт: ніжэй сярэдняга паказчык разгорнутасці

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

выказвання назіраецца ў 11 вучняў (4%) з сярэднім і высокім узроўнямі развіцця звязнага вуснага маўлення, і наадварот, – у 45 вучняў (16%) з нізкім і здавальняючым узроўнямі гэты паказчык вышэй за сярэдні. Аперыруючы дадзенымі лічбамі, а таксама абапіраючыся на ўласны педагагічны вопыт, аўтар прыйшоў да высновы, што дадзены крытэрый (аб'ём выказвання) знаходзіцца, як правіла, ва ўзаемасувязі з узроўнем развіцця звязнага вуснага маўлення.

Яскравым паказчыкам узроўню развіцця звязнага вуснага маўлення з'яўляецца такі крытэрый, як перарывістасць. Аналіз вусных выказванняў пяцікласнікаў паказаў, што толькі ў 59% апанентаў у маўленні адсутнічаюць лагічна і сэнсава не абгрунтаваныя паўзы, паўторы. Дадзены факт тлумачыцца "адсутнасцю наступнай думкі ці няўменнем яе выразіць, а таксама эмацыянальным напружаннем, звязаным з цяжкасцямі сітуацыі выказвання" [2, с. 26]. Сумесны творчы пошук на аснове камунікатыўнай дзейнасці, работа ў групах, парах, заснаваныя на абавязковым выкарыстанні настаўнікам разнастайных форм і прыёмаў працы, спрыяюць паляпшэнню асноўных крытэрыяў звязнага маўлення школьнікаў. На жаль, сітуацыя сумеснага творчага пошуку, заснаванага на дзейсным падыходзе, рэдка мае месца на ўроках літаратуры ў агульнаадукацыйных установах. Найбольш распаўсюджаным відам дыялагічных зносін на ўроках з'яўляецца ўдзел школьнікаў у эўрыстычнай гутарцы.

Вельмі важна, каб у працэсе суразмоўніцтва настаўніка з вучнем стымуляваўся поспех у авалоданні школьнікамі ўменнямі і навыкамі звязнага маўлення. Пры ўмове правільнай арганізацыі працы па развіцці звязнага маўлення ў вучняў "фарміруецца матывацыя дасягнення поспеху" [12, с. 100]. Гэты важны псіхалагічны аспект заўсёды павінен мець на ўвазе настаўнік-славеснік і не акцэнтаваць увагу на вучнёўскіх недакладнасцях, няўдачах і памылках з тым, каб абысці моманты, калі "фарміруецца матыў пазбягання няўдач і вучань "замыкаецца" ў сабе" [12, с. 100].

## Заключэнне

Як паказвае практыка, у працэсе навучання літаратуры, якая на сучасным этапе "з'яўляецца асобасна арыентаваным прадметам, культураўтваральным ядром у сістэме навучання і выхавання" [10, с. 21], развіццё маўлення становіцца прыярытэтным у параўнанні з навуковымі звесткамі. Беручы пад увагу недастатковы ўзровень развіцця звязнага вуснага маўлення вучняў V класа (эксперыментальныя дадзеныя), а таксама абапіраючыся на прынцыпы тэорыі паэтапнага засваення разумовых дзеянняў П.Я. Гальперына, аўтар прапаноўвае наступныя практычныя рэкамендацыі па арганізацыі працы, накіраванай на развіццё асноўных уменняў і навыкаў звязнага вуснага маўлення вучняў V–VI класаў:

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

1. Паказ узораў (вусныя выказванні мастакоў слова, настаўніка, загадзя падрыхтаваных вучняў і інш.).

2. Падмуркам для пасляховага працэсу развіцця звязнага вуснага маўлення з'яўляюцца раней засвоеныя першапачатковыя літаратуразнаўчыя і лінгвістычныя тэрміны і паняцці. Непасрэдна да навучання складанню вусных выказванняў можна падыходзіць, толькі папярэдне вызначыўшы ўзровень ведаў вучняў у гэтых накірунках.

3. Абавязковы ўлік "наяўных магчымасцей вучня" (індывідуальная праца і праца ў групах павінны грунтавацца на дадзеным прынцыпе).

4. Аналіз і рэдагаванне вусных выказванняў па прапанаваным алгарытме.

5. Алгарытм абмеркавання вуснага выказвання ўяўляе сабой "поўны набор арыенціраў", неабходны для фарміравання асноўных уменняў і навыкаў звязнага вуснага маўлення (кожны з крытэрыяў ацэнкі звязнага вуснага маўлення патрабуе асобнай папярэдняй працы).

6. Картка ацэньвання вуснага выказвання з распрацаванай 10-бальнай шкалой з'яўляецца "сістэмай указанняў" (дадзеная шкала дае магчымасць вучням самім ацаніць і карэкціраваць сваю працу).

7. Абавязковая наяўнасць "неадкладнай сігналізацыі аб фактычна дасягнутых паказчыках" прыводзіць да ўзнікнення зваротнай сувязі, якая дзейнічае неадкладна ў ходзе складання вуснага выказвання і "забяспечвае кіраванне ім (працэсам працы над выказваннем. – *С.Д.*) з боку вучня".

Такім чынам, аўтар рэкамендуе настаўніку-славесніку пры арганізацыі працы па развіцці звязнага вуснага маўлення вучняў V–VI класаў абапірацца на вышэй азначаныя практычныя рэкамендацыі, а таксама арыентавацца на актывізацыю маўленчай дзейнасці школьнікаў праз практычную накіраванасць, заснаваную на асобасна арыентаваным навучанні.

*ЛІТАРАТУРА*


1. ***Волков, И.Ф.*** Литература как вид художественного творчества: кн. для учителя / И.Ф. Волков. – М.: Просвещение, 1985. – 192 с.
2. ***Леонов, С.А.*** Речевая деятельность на уроках литературы в старших классах: методические приемы творческого изучения литературы: учеб. пособие / С.А. Леонов. – М.: Флинта: Наука, 1999. – 224 с.
3. ***Архангельский, К.*** Опыт анализа письменной речи учащихся / К. Архангельский // Русский язык в советской школе. – 1929. – № 3. – С. 79-87.
4. ***Жинкин, Н.И.*** Развитие письменной речи учащихся III–VII классов / Н.И. Жинкин // Известия АПН РСФСР. – М.: Изд-во АПН РСФСР, 1956. – Вып. 78. – С. 141-250.
5. ***Ладыженская, Т.А.*** Система работы по развитию связной устной речи учащихся / Т.А. Ладыженская. – М.: Педагогика, 1974. – 256 с.
6. ***Клевченя, М.С.*** Развитие логически связной и выразительной письменной речи учащихся / М.С. Клевченя // Уч. записки Полоцк. гос. пед. ин-та им. Г. Скорины. – Полоцк, 1958. – Вып. 2. – С. 149-165.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

7. ***Китаев, Н.Н.*** Критерии оценки ученических сочинений / Н.Н. Китаев. – М.: Изд-во АПН РСФСР, 1961. – 147 с.
8. ***Протчанка, В.У.*** Актуальныя праблемы тэорыі і практыкі навучання беларускай мове / В.У. Протчанка. – Мінск: НІА, 2001. – 212 с.
9. Мастерство устной речи: пособие для учителя / под ред. В.В. Голубкова. – М.: Просвещение, 1965. – 200 с.
10. ***Бельскі, А.І.*** Літаратурацэнтрызм: педагагічныя артыкулы, нарысы / А.І. Бельскі. – Мінск: Адукацыя і выхаванне, 2008. – 144 с.
11. ***Андроников, И.Л.*** А теперь об этом / И.Л. Андроников. – М.: Сов. писатель, 1981. – 448 с.
12. ***Яленскі, М.Г.*** Методыка выкладання беларускай мовы. Сучасная лінгвадыдактыка: вучэб. дапам. для студэнтаў філал. спецыяльнасцей устаноў, якія забяспечваюць атрыманне выш. адукацыі / М.Г. Яленскі. – Мінск: Адукацыя і выхаванне, 2005. – 224 с.
13. Формирование знаний и умений на основе теории поэтапного усвоения умственных действий / под ред. П.Я. Гальперина, Н.Ф. Талызиной. – М.: Изд-во Моск. ун-та, 1968. – 136 с.

Паступіў у рэдакцыю 17.09.2009 г.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова